ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

НАСТАЎНІЦКА

**У аўторак вечарам у Палацы Рэспублікі адбыўся Рэспубліканскі баль выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў, галоўнымі ўдзельнікамі якога сталі лепшыя выхаванцы ўсіх ВНУ краіны: 270 учарашніх студэнтаў, а сёння ўжо маладых спецыялістаў. Павітаць іх прыехалі ўсе міністры, у чыіх ведамствах ёсць вышэйшыя навучальныя ўстановы, іншыя дзяржаўныя кіраўнікі, рэктары. Традыцыйна лепшых выпускнікоў павіншаваў і Прэзідэнт краіны Аляксандр Рыгоравіч ЛУКАШЭНКА.**



# "Лепшы спосаб стаць грамадзянамі багатай дзяржавы — стварыць яе самім"



Прэзідэнт не ўтойвае, што цэніць падобныя сустрэчы з моладдзю. "З боку дзяржавы робіцца стратэгічны разлік на тое, што наша палітыка, памножаная на энергію і энтузіязм моладзі, падыме краіну на такую гістарычную вышыню, пра якую нашы продкі маглі толькі марыць", — адзначыў кіраўнік дзяржавы, выступаючы перад выпускнікамі.

Ён заўважыў, што ўсё больш і больш маладых людзей займаюць кіруючыя дзяржаўныя пасады. Яны ўсё часцей уплываюць на развіццё прарыўных напрамкаў навукі, інфармацыйных тэхналогій і інавацыйных вытворчасцей, адкрываюць новыя прасторы ў сучаснай культуры.

З мэтай стварэння ўмоў для рэалізацыі маладзёжных праектаў у краіне больш як 15 гадоў працуюць спецыяльныя фонды прэзідэнта, штогод прызначаюцца сотні прэзідэнцкіх стыпендый лепшым студэнтам, аспірантам, маладым вучоным і дзеячам культуры; праводзяцца конкурсы, якія адкрываюць маладым артыстам шлях у вялікае мастацтва.

"Вы пачынаеце дарослае жыццё ў незвычайны час эканамічнага і тэхналагічнага рыўка, якога яшчэ не ведала найноўшая гісторыя, — сказаў прэзідэнт, звяртаючыся да выпускнікоў. — Хочацца, каб менавіта вы сталі каталізатарам дзелавой і творчай актыўнасці ў любой справе, праявілі сябе ініцыятыўнымі, крэатыўнымі, нераўнадушнымі людзьмі. І не бойцеся адстойваць свой пункт гледжання, змагацца за рэалізацыю ўласных ідэй. Не разменьвайце свой талент на дробязі і не здраджвайце сваёй мары".

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што дзяржава заўсёды падставіць плячо маладым. "Аднак не забывайце, што ў любой справе ў першую чаргу трэба разлічваць на ўласныя сілы, самім ствараць сабе рэпутацыю і зарабляць аўтарытэт", — падкрэсліў ён.

"Нягледзячы на крызісы і знешнія пагрозы, Беларусь развіваецца, — заявіў А.Лукашэнка. — Так што тыя, хто робіць стаўку на эміграцыю, рана ці позна прайграюць, бо лепшы спосаб стаць грамадзянамі багатай і квітнеючай дзяржавы — гэта стварыць яе самім".

Асаблівую падзяку прэзідэнт адрасаваў рэктарам і выкладчыкам ВНУ. "Місія педагога — адна з самых складаных і адказных, бо менавіта ён фарміруе характары і волю, вучыць маладых валодаць пяром, якім яны ў будучыні напішуць слаўныя старонкі ў летапісе сваёй краіны", — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што дзяржава чакае ад выкладчыкаў перш за ўсё актыўнай грамадзянскай пазіцыі, сучасных лекцый, якія адпавядаюць духу часу і патрэбам студэнтаў, цеснай сувязі педагагічнай і даследчай работы з практыкай, фарміравання ў кожнай ВНУ ўласных навуковых напрамкаў. "Нам патрэбны такія выкладчыкі, якія стануць сапраўдным жыццёвым прыкладам для студэнтаў. Гэта павінна быць маркай беларускай вышэйшай школы", — падкрэсліў А.Лукашэнка.

Напрыканцы афіцыйнай часткі мерапрыемства дзесяць лепшых выпускнікоў атрымалі Падзяку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і каштоўныя падарункі. Потым выпускнікі па традыцыі прынеслі клятву дзяржаве, навуцы і грамадскім каштоўнасцям.

А далей былі сапраўдны баль, дзе гучалі вальсы і факстроты, і прыём ад імя кіраўніка дзяржавы ў гонар лепшых выпускнікоў айчынных ВНУ.

**Галіна СІДАРОВІЧ.**

НА ЗДЫМКАХ: вальс з Прэзідэнтам танцуе студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ксенія Наліўкіна; дзесяць выпускнікоў атрымалі Падзяку Прэзідэнта і зрабілі фота на памяць.

Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА.